# Ogłoszenia parafialne

## Вялікі Пост 6 нядзеля

*27 marca 2021*

**Аб'явы**

**на нядзелю 28 03 2021**

1. Адзведзіны хворых са св. Камуніяй: тых, што пражываюць у вёсках у аўторак 30 сакавіка; тых, што пражываюць у горадзе ў сераду 31 сакавіка. Запісваць хворых можна ў канцылярыі і па тэлефоне.
2. У панядзелак пасля Імшы спатканне для падрыхтоўкі літургіі Пасхальнага Трыдуума.
3. У сераду а 17.30 у капліцы катэхеза да сакрамэнту бежмавання.
4. У сераду пасля Імшы спатканне для мінстрантаў і лектараў.
5. У Вялікі Чацвер св. Імша Вячэры Пана ў 19.00. Пасля св. Імшы перанясенне Пана Езуса да Цямніцы і адарацыя да 22.00. Пасля вячэрняй Эўхарыстыі Песні Жальбы (тры часткі).
6. У Вялікую Пятніцу у 18.30 крыжовы шлях, потым а 19.00 Літургія Мукі Пана. Пасля перанясення Пана Езуса да Гробу Пана – адарацыя да 22.00. Распачнём навэнну перад Урачыстасцю Божай Міласэрнасці. Запрашаю да супольнай і індывідуальнай малітвы.
7. У Вялікую Пятніцу сціслы пост, які датычыць усіх ва ўзросце ад 18 да 65. Асобы ад 14 – 18 гадоў – устрымліваюцца ад мясных страваў.
8. У Вялікую Суботу традыцыйнае благаслаўленне ежы. Гэта будзе адбывацца ў капліцы а 9.00, 12.00 і а 15.00, а таксама: 10.00 – Балаі, 10.30 – Андроны, 11.00 - Кураполле, 12.45 – Лукашова, 13.15 – Груздава, 14.00 – Юнькі,14.20 - Курсевічы.
9. Літургія Пасхальная адбудзецца ў ноч з суботы на нядзелю ў 22.00. Просьба прынесці з сабой свечкі. Наступныя св. Імшы а 11.00. **Не будзе Св. Імшы а 15.00.**
10. Дзякую за складзеныя ахвяры на патрэбы касцёла.